# ЗЯМНОЕ І НЯБЕСНАЕ Ў ПАЭЗІІ МАР'ЯНА ДУКСЫ

**Т. П. Барысюк**
*Цэнтр даследаванняў беларусскай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
*Мнск, Беларусь*
*E-Mail: btp@tut.by*

Зямное і нябеснае, свецкае і рэлігійнае пераплятаюцца ў паэзіі Мар'яна Дуксы, які сёлета адсвяткаваў 75-гадовы юбілей.

Зямное для лірычнага героя М.Дуксы – у яднанні з роднай прыродай. Так, збожжа ў яго ўспрыманні з'яднана з суседнімі бярозамі і чаромхай, а таксама са спевамі салаўя і перапёлкі ("Жытняя паляна"). Гэта і прыдарожны камень-мудрэц: "Якое ж ён густое шматгалоссе / былых людзей, шматлікіх дрэў і траў, / дажджоў, мяцеліц, паламаных лёсаў/ сваім нутром цярплівым увабраў!" [1, с. 76] ("Валун"). Лірычны герой паважае позні шыпшыннік за яго прагу жыцця – за "трываласць пладоў / і нястомнасць цвіцення" [1, с. 76] ("Позні шыпшыннік"). Зямное – і ў прыцягенні да філалагічнай сферы, дзе лірычны герой бачыць неадпаведнасць паміж сэнсава-аксіялагічнай значнасцю слова і колькасцю сінонімаў да яго: у слова "ударыць" сінонімаў шмат, а ў слова "любоў" – мала ("Неадпаведнасць"). Гэта ўспамін пра першае спатканне, падчас якога "знікае плоць, / А светлы шар душы / трапечацца / над цемрай утрапёна" [1, с. 124]. Гэта жаданне зрабіць жыццё каханай прыгажэйшым і лепшым, напоўніць яго сваім клопатам і служэннем ёй ("Калі сабраўся ў госці да жанчыны…").

У вершы "Прыйсці да алтара" лірычны герой М.Дуксы раіць заходзіць у царкву і ў радасці, і ў горы, і асабліва ў старым узросце, калі "…цяпер да Бога / табе бліжэй, бліжэй…" [2, с. 4]. Лірычны герой заўсёды адчувае прысутнасць Бога побач з сабой, асабліва падчас малітвы ("Ты побач са мною"). Сцвярджаючы, што "ў кожнага шлях свой да Бога", аўтар вобразна-эмацыянальна апісвае гэты шлях так: "…праз сонца, сутонне імжы, / праз музыку светлай душы, / праз смутак, маўклівы і чорны" [2, с. 14]. Прычынай такіх няроўных шляхоў М.Дукса называе грахі чалавечыя ("У кожнага шлях свой да Бога…"). Лірычны герой лічыць "жывую веру" "нябесным посахам" для падтрымкі "люду хілага" ("Прыпадымі…"). Аўтар лічыць, што беларусы выжылі ў складаных гістарычных абставінах, бо "наш народ не выракся Цябе" [Бога. – Т.Б.] ("А наш народ не выракся Цябе"). Вялікдзень для лірычнага героя М.Дуксы – свята "душы абуджэння" і "дзівоснага Змёртвыхпаўстання" вечнажывога Езуса, раскутага "смерці ланцуга". Успрымаючы сына Божага як духоўны арыенцір, аўтар ад імя ўсіх беларускіх вернікаў піша: "Езу, даруй за правіны людскія. / Недзе Ты блізка ў хвіліны такія…/ Ў нашыя сэрцы прыйдзі веснавыя – / разам з Табою мы вечнажывыя" [2, с. 29–30]. Паэт называе душу чалавека "птушкай вечнасці", якая "выпадкова заляцела" "з зорнага каўша" "у збянтэжанае цела" і якая павінна пасля смерці чалавека вярнуцца "зноў у родны дом", на неба [2, с. 75–76] ("Можа, з зорнага каўша…").

Такім чынам, зямное ў паэзіі Мар'яна Дуксы выяўляецца ў ідэях душэўна-эмацыянальнай еднасці лірычнага героя з прыродай, родным словам і каханай жанчынай. А рэлігійныя матывы ўвасабляюцца праз ідэі неабходнасці наведваць царкву, каб быць бліжэй да Бога, вера ў якога з'яўляецца абярэгам ад знішчэння нацыі.

### *ЛІТАРАТУРА*

1. Дукса, М. Заснежаныя ягады: Вершы і паэма / М.Дукса. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 160 с.
2. Дукса, М. Прыйсці да алтара: Вершы / М.Дукса. – Мінск: Про Хрысто, 2003. – 100 с. – (Бібліятэка часопіса "Наша вера").